заслоніш смехам. / Хай выльюцца чыстыя слёзы, / заменяцца вершы прозай… / вострыя ў *лёсу слёзы*».

Такім чынам, можна адзначыць, што ў паэтычных творах гукапіс выступае адным з апорных элементаў, своеасаблівым стылістычным прыёмам, пры дапамозе якога аўтары перадаюць не толькі гукі рэальнай прыроды, а і выражаюць свае пачуцці, эмоцыі. У паэтычным кантэксце гук становіцца на адзін функцыянальны ўзровень са словам – валодае як формай, так і сэнсам. Адрозненне паміж імі ў тым, што калі фармальны і змястоўны кампаненты слова мы ведаем спачатку, то пра змест гука мы можам даведацца толькі ў канкрэтна акрэсленым кантэксце.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Малажай, Г. М. Лінгвістычны аналіз тэксту : вучэб. дапам. / Г. М. Малажай. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 1992. – 367 с.
2. Рагойша, В. П. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці : для школьнікаў і абітурыентаў / В. П. Рагойша. – Мінск : Нар. асвета, 2009. – 303 с.


---

# МІФАЛАГІЧНА-МІСТЫЧНЫЯ І РЭАЛІСТЫЧНЫЯ МАЛЮНКІ Ў АПОВЕСЦІ А. КАЗЛОВА «НЕЗЛАМАНАЯ СВЕЧКА»


*Т. М. Тарасава (Мінск, Беларусь)*



Сучасная беларуская проза вылучаецца глыбіннай засяроджанасцю на духоўным свеце сучасніка, гарманічным спалучэннем міфалагічна-містычных і рэалістычных малюнкаў у творах. Прысутнасць у сённяшняй прозе старэйшага і маладога пакалення пісьменнікаў вызначае разнастайнасць творчых метадаў даследавання рэчаіснасці, стылёвых і жанравых трансфармацый. Дастаткова пашыранай з’явай стала сёння спалучэнне як рэалістычных, так і ўмоўных сродкаў паказу жыцця пісьменнікам А. Казловым. У аповесці «Незламаная свечка» (2000) арганічна паяднаны рэалістычная і містычна-фальклорная прасторы: выкарыстанне замоў, праклёнаў і іншых язычніцкіх «практыкаванняў». Міфапаэтычны падтэкст твора паглыбляе унутраны свет герояў, аналіз псіхалагічных працэсаў у сітуацыі парога/мяжы.



***Ключавыя словы:*** міфалагічна-містычны малюнак; рэалістычная прастора; беларуская проза; экзістэнцыяльны аспект.


Сучасная беларуская проза вылучаецца глыбіннай засяроджанасцю на духоўным свеце сучасніка, сілай эмацыянальнага ўздзеяння на чытача, гарманічным спалучэннем міфалагічна-містычных і рэалістычных малюнкаў у творах. У літаратуры канца ХХ–пач. ХХІ ст. плённа працавалі і працуюць пісьменнікі з ярка выражанай творчай індывідуальнасцю (Янка Брыль, Васіль Быкаў, Іван Шамякін, Іван Пташнікаў, Віктар Казько, Андрэй Федарэнка, Ігар Бабкоў, Пятро Васючэнка, Адам Глобус, Барыс Пятровіч, Уладзімір Сцяпан і інш.). Іх творы сталі набыткам шырокага чытача, атрымалі прызнанне літаратурнай грамадскасці. Апошняе дзесяцігоддзе ХХ ст. дало магчымасць старэйшаму пакаленню пісьменнікаў увесці ў літаратуру цэлы

пласт мінулага народнага жыцця – сталінскія рэпрэсіі, гвалтоўная калектывізацыя, незаконныя дзеянні органаў дзяржаўнай бяспекі, драматычныя старонкі ваеннага часу.

Неверагодныя факты, падзеі, глыбокія перажыванні ўражваюць чытачоў сваёй ірэальнасцю, шчырай праўдзівасцю, дакументальнай асновай. Кнігі Л. Геніюш («Споведзь»), С. Грахоўскага («Такія сінія снягі», «Зона маўчання», «З воўчым білетам»), Б. Мікуліча («Аповесць для сябе»), П. Пруднікава («Яжовыя рукавіцы», «Пекла») кранаюць бескампраміснымі ацэнкамі падзей, эмацыянальнай узрушанасцю, трагічнымі жыццёвымі калізіямі.

У лёсавызначальны для беларускага народа перыяд канца XX – пачатку XXI ст. узрасла роля дакументальна-аўтабіяграфічнай прозы, якая фіксуе важныя этапы самарэалізацыі асобы, творцы. Давер да аўтара, які сам перажыў і не па чутках ведае тое, пра што піша, безумоўна, вялікі. Папулярнасць аўтабіяграфічнай прозы (асабліва дзённікавай) Я. Брыля, Н. Гілевіча, В. Быкава, І. Шамякіна на мяжы тысячагоддзяў абумоўлена перш за ўсё тым, што ўнутранае пісьменніцкае жыццё – глыбокае і невычэрпнае, а мастакоўскія ацэнкі недагматычныя. Вобраз творцы паўстае як вобраз чалавека разумнага, уважлівага, які ўвесь час знаходзіцца ў творчых і жыццёвых пошуках.

Прысутнасць у сённяшняй прозе старэйшага і маладога пакалення пісьменнікаў вызначае шырыню і глыбіню яе тэматыкі і праблематыкі, разнастайнасць творчых метадаў даследавання рэчаіснасці, стылёвых і жанравых трансфармацый. Дастаткова пашыранай з'явай стала сёння спалучэнне пісьменнікамі як рэалістычных, так і ўмоўных сродкаў паказу жыцця (В. Казько, Я. Сіпакоў, Ю. Станкевіч, А. Федарэнка і інш.).

Сучасныя пісьменнікі востра адчуваюць духоўны бок жыцця, звычайнага, штодзённага. Заглыбленне творцаў у псіхіку герояў адбываецца не толькі і не столькі праз сацыяльныя матывіроўкі, колькі праз экзістэнцыяльныя (глыбока падсвядомыя). Экзістэнцыяльная прастора многіх найноўшых твораў пабудавана на межах/парогах. Мастакоў слова (А. Казлова, У. Сцяпана, А. Федарэнку, С. Алексіевіч і інш.) цікавіць не проста логіка смерці, фізічнай ці духоўнай, а найперш логіка жыцця, чалавечай псіхікі, акрэсленых праз матыў парога/мяжы, праз адначасовасць супярэчлівых поглядаў на свет, няўлоўныя адценні думак, выказаных і нявыказаных слоў.

Мастацтва слова спакон веку хвалявалі пытанні дабра і зла. Прырода светлага і цёмнага ў чалавеку – прыярытэтная ў творчасці мастака слова Анатоля Казлова. Аповесць «Незламаная свечка» (2000) крытыка назвала сапраўднай творчай удачай пісьменніка, тут арганічна паяднаны рэалістычная і містычна-фальклорная прасторы: вясковы асяродак даваў пісьменніку багатую магчымасць выкарыстання замоў, праклёнаў і іншых язычніцкіх «практыкаванняў». А. Казлоў у аповесці спрабуе даць сваё тлумачэнне злу, трагедыям, насіллю, гвалту на зямлі. З даўніх часоў варагуюць два вясковыя роды – Смалякоў і Барташэвічаў. На вёсцы баяліся чапаць старую Марфу Смаляк, пра яе як варажбітку гаварылі, што «такія па-простаму Богу душу не

аддаюць» [1, с. 85]. Старая Смалячыха, седзячы за кроснамі сакавіцкім днём, пяшчотна думала пра сына Сяргея і нявестку Галю. Але думкі старой супярэчлівыя і мітуслівыя, гняце і цісне яе сэрца тое, што Сяргей пайшоў у лес дапамагчы сваяку валіць сосны на новую хату, што Галя затрымліваецца на абед і дзяцей няма са школы. Замест дзяцей і ўнукаў у хату прыйшла страшная навіна: у лесе недарэчна загінуў сын Сярожа, бацька трох дзяцей.

Прычыну смерці сына, мужа і бацькі сям'я бачыць у порчы-пракляцці роду Барташэвічаў. Гісторыя стасункаў Смалякоў і Барташэвічаў даўняя. Калісьці іх прапрадзеды наймацнейшымі сябрамі лічыліся, але закахаліся ў адну дзяўчыну і пачалі тайна варагаваць. Крыўды і помсты апанавалі іх сем'і. Да сіл цемры і згубы звяртаецца Надзька Барташэвіч. А. Казлоў рэалістычна дакладна перадае ў творы характар жанчыны, яе злосць да ўсяго жывога, поўную адсутнасць міласэрнасці і спагады. Надзька Барташэвіч пераканана, што ў смерці яе сына Івана вінаваты Сяргей Смаляк, і просіць злыя сілы аб яго пагібелі; сама ж марыць аб дзіцяці, у душы якога, паводле яе слоў, «пакладзістасць і дабрыня не запалі б у яго» [1, с. 103], але жанчына ў лютасці сваёй забылася на боскі закон – помсціць жыццю і чакаць ад яго літасці нельга.

Сем'і Барташэвічаў і Смалякоў паяднаны злосцю, праклёнамі, варагаваннем, і ніхто з іх першы не асмеліцца спыніць ланцуг смерцяў. Старая Матруна Барташэвіч, свякруха Надзеі, папярэджвае нявестку аб іх чарзе пакутаваць: *Яшчэ ж ні разу так не сталася, каб пасля смерці ў Смалякоў у нас хто-небудзь ды не знябожыўся. А калі ў нас хаўтуры, то і яны чакаюць таго ж* [1, с. 105]. Смерць у Смалякоў выклікала ў душы Сяргеевага сына Антона новае зло, больш цёмнае і страшнае, бо гэтае зло пасялілася ў яшчэ дзіцячай душы, незагартаванай, кволай, крохкай. Антон застаўся адзіным мужчынам у Смалякоў і адчувае сваю адказнасць за род, толькі яго дзіцячыя плечы не могуць вытрываць гэткі цяжар, і хлопчык звяртаецца за дапамогай да чорных дэманічных сіл, становіцца іх новай ахвярай, каб працягнуць злачыннае шэсце па зямлі.

У аповесці «Незламаная свечка» ёсць дакладна перададзеная пісьменнікам сцэна, якая магла б пакласці канец порчам-пракляццям паміж сем'ямі. Надзька Барташэвіч прыходзіць у хату да Смалякоў, каб абвергнуць людскія чуткі пра яе віну за смерць Сяргея і сказаць, што душа ў яе чыстая. На што старая Смалячыха прапаноўвае: *Мой дзед, пухам яму зямля, разумны, відушчы чалавек быў, вось ён мяне і вучыў: калі злобы, бяды адзін аднаму не рабіў, калі напраслінай цябе аблілі, то збярыся з тым чалавекам разам, памаліся, стоячы перад абразамі на каленях, і пераламайце ўдвух асвечаную ў царкве грамнічную свечку… Я гатова зараз жа с табою стаць вось тут на калені. Антон, – звярнулася Марфа да ўнука, – дастань, дзетка, за іконай самую вялікую свечку, падай яе мне.*

*Надзька збялела. Чаго-чаго, а гэтага яна аніяк не чакала. «Што рабіць? Як выпутацца? А калі і праўда сілу мае выдумка старой? І ці выдумка гэта?»*

*– Хадзі ў кут. Станавіся побач са мною. – Марфа апусцілася на калені перад абразамі. – Бяры правай рукой адзін канец свечкі. – Смалячыха чакала. Надзька ж ад парога не зрабіла і кроку.*

*– Чаго стаіш там? Баішся? Я ж буду клясціся сама сабою, вось імі, чыстымі душамі ўнукаў, а ты сабою і сваім сынам. Ну, хадзем жа! – Вочы ў Марфы засцілала слязамі. Надзька, ні слова не кажучы, крутнулася на месцы і, ляпнуўшы дзвярыма, выскачыла ў сенцы.*

*Свечка ў руках Марфы засталася незламанай…* [1, с. 119].

Незламаная свечка дэманструе маральна-этычнае аблічча адной з гераінь, а значыць – ланцуг варагавання будзе доўжыцца і доўжыцца. Нябачныя сілы змроку, зла перамагаюць, і на сцежку цемры стаў сын Сяргея Антон – адзіны мужчына-заступнік у хаце. Чыстая высакародная мэта заступніцтва азмрочана чорнай апантанай помстай дзіцячай неакрэплай душы. Падлетак, уратаваны калісьці бабуляй з азярыны-копанкі дзеля жыцця, заручыўшыся цяпер дэманічнымі сіламі, адбірае гэтае жыццё ў Косціка Барташэвіча.

Такім чынам мінулае паядналася з сучаснасцю і разгортваецца ў будучыню. Пісьменніцкая думка аб крохкасці жыцця, нітка якога «рвецца хутчэй павуціння», аб мацаванні духоўнай сувязі са светлымі, Боскімі сіламі на зямлі, у сусвеце дзеля выратавання чалавечай душы магістральная ў аповесці.

Адкрыты фінал твора вырашаны са шматзначным і па-філасофску глыбокім сэнсам. Апошнія радкі: *Нешта ў слове. Слова ў нечым. Мы па-за ўсім…* [1, с. 118] – ключ-разгадка да ўсёй аповесці, канцэпцыя якой цалкам пабудавана на негатыўнай сіле Слова. Невыпадкова ў творы так многа плётак, пераказаў, чутак, замоў, пагалосак. На вёсцы людзі стараніліся Барташэвічаў і Смалякоў, бо з імі «*жартаваць, што з агнём у сене гуляць. Не ведаеш: добра абыдзецца ці попелам праз пальцы пасыплецца. То ўжо лепш змоўчаць, вочы адвесці ды пра што-небудзь старонняе, звычайнае пагаманіць. Спакайней на душы будзе і начамі варочацца з боку на бок не трэба…*» [1, с. 102]. Божым дарам Слова, на думку пісьменніка, надзелены толькі чалавек, у вуснах якога Слова мае вялікую нябачную духоўную сілу. Пра гэта ведалі далёкія нашы продкі ў замовах, заклінаннях, дзе праз Слова чалавек матэрыялізуе думку. Менавіта Слова яднае чалавека з касмічнымі сіламі дабра і зла, і зямны лёс чалавека прадвызначаны яго Словамі.

Міфалагічна-містычны кампанент арганічна прысутнічае ў штодзённым жыцці герояў, сувязі паміж якімі ўстанаўліваюцца ірацыянальна, праз сістэму таямніц, і ўсё гэта адбываецца ў межах рэалістычнага метаду пісьменніка. Аповесць «Незламаная свечка» засведчыла схільнасць пісьменніка ўважліва даследаваць міфалагічныя аспекты духоўнай культуры беларусаў. Міфапаэтычны падтэкст твора істотна паглыбляе унутраны свет герояў, аналіз псіхалагічных працэсаў у сітуацыі парога/мяжы.

### *Бібліяграфічны спіс*

1. Казлоў, А. Незламаная свечка: аповесці / А. Казлоў. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 222 с.